***Таццяна Пладунова***

## ФАЛЬКЛОР ЯК ЭКАСІСТЭМА КУЛЬТУРЫ[1]

*Праз злыя дзеянні тых, хто разбурае традыцыі, забываюцца прынцыпы, на якіх трымае сябе дабрабыт і гармонія сям'і і нацыі.*
Бхавадгита[2]

Не сакрэт, што сёння для беларусаў рызыка забыцця і страты сябе як народа відавочна. У гэтым кантэксце варта прааналізаваць, наколькі склаўшаяся практыка выхавання і навучання дзяцей і моладзі ва ўстановах адукацыі і культуры Беларусі[3] мае патэнцыял пераламіць такія тэндэнцыі. І, калі прыняць за ўмову, што наша грамадства ўсё ж такі мае на ўвазе самазахавацца ў культурным і фізічным стане яшчэ пэўны гістарычны адрэзак, то варта спытаць у тых, хто адказвае за адукацыйна-выхаваўчы працэс такіх устаноў: ці адпавядае наша мастацкая адукацыя, эстэтычнае выхаванне патрэбам самазахавання грамадства, стабільнага будучага краіны?

Агульнавядома, што галоўнай умовай сацыялізацыі маладога пакалення ў паспяховым, стабільным грамадстве з'яўляецца засваенне культурнай спадчыны свайго народа. І менавіта народная традыцыя з'яўляецца важнейшым каналам перадачы сацыякультурнага вопыту. Гэтая рыса – рыса стабільных, упарадкаваных грамадстваў. Беларусь сёння – канешне – толькі на шляху да стабільнасці. Праблема перадачы культурнай спадчыны закрыта праблемамі самазабеспячэння. Яе вырашэнне – быццам бы адкладзена. Пры гэтым ніхто з «адкладальнікаў» не дае гарантый, што будзе каму вырашаць адкладзеную праблему ў будучым, і ўвогуле, што праз пэўны тэрмін гэта будзе магчыма. Прагрэс парушэння гісторыка-культурных сувязей паміж пакаленнямі, перапыненасць духоўнай «повязі часоў», ужо сёння адгукаецца разбуральнымі наступствамі. Усё больш абясцэньваюцца спрадвечныя маральныя нормы, павялічваецца колькасць антысацыяльных з'яў ў падлеткавай стыхіі, расце злачыннасць сярод дзяцей і моладзі, узмацняецца анамія[4] грамадства. Усё гэта ў будучым можа выбухнуць праблемай «згубы пакаленняў». Падаецца, толькі «здаровае» выхаванне праз уключэнне дзяцей і моладзі ў культурны ландшафт краіны можа забяспечыць развіццё нашага грамадства ў будучым.

Таму і дзейнасць устаноў культуры і адукацыі павінна быць накіравана на ўзнаўленне т о й часткі культуры, якая прадстаўлена ў *лепшых нацыянальных традыцыях беларусаў*. І менавіта ў традыцыйнай культуры – крыніцы духоўнага імунітэту, душэўнага здароўя любой нацыі. У сітуацыі «культурнага дзвюхмоўя» фальклор – як паратунак у галіне экалогіі культуры[5] і роднай мовы. Чаму? Фальклор – і ёсць галоўны «сведка» існавання і беларусаў, і беларускай мовы! Ізноў жа, ў сёняшніх умовах ён выступае і як супертэкст (крыніца інфармацыі пра *сутнасць*), і захавальнік (збор *формаў* трансляцыі). Фальклор – жывое сведчанне старажытнасці (значыць, і – жыццяздольнасці) нашай культуры. Разам з тым – культурна-антрапалагічны «дакумент» светаадчування нашых продкаў, успрымання наваколля і ўзаемадачыненняў з ім, зашыфраваных у такіх этнічных адметніках-кодах як «рух», «гук», «знак», «рытуал», «міф». Сэнс і змест якіх да нас данесены ў народным меласе, вакальнай і інструментальнай этнафоніі, сімволіцы і каляровай гамме рушнікоў і аддзення, у карагодах, гульнях, танцах, вобразах народнай паэзіі, паданняў, казак. У семантыцы народнага мастацтва Беларусі – усім тым, што складае э т н а п р а с т о р у беларускага часу. У фальклоры – як э к а с і с т э м е к у л ь т у р ы , у якой захоўваюцца законы і этапы сацыякультурнага развіцця грамадства, якое адсочвае яго эвалюцыйнае, спіральнае быццё-ўзнаўленне ў прасторы-часе. Так, у кантэксце перспектывы «згубы пакаленняў» менавіта ў «выключэнні» сябе з уласнай этнапрасторы шмат у чым хаваюцца вытокі духоўнай разгубленасці, душэўнай кволасці і закамплексаванасці маладых сёння. Так пазнанне сябе ў сваёй этнапрасторы мусіць забяспечыць гарманічнае развіццё і якаснае набыццё ведаў дзеля далейшага «пазнання свету». Таму, як да «свайго» лягчэй і цікавей рухацца ў пазнанні абшараў … славянскай – еўрапейскай – іншаземнай – сусветнай культуры. Пачуццё сваёй «неякаснасці», адсутнасць гонару за сябе як носьбіта пэўнай культуры з дзяцінства закладаюць сумненні ў сваёй вартаснасці і праве на культурнае, і як працяг, творчае самавызначэнне. А гэта ўжо сігнал да выратавання! Таму, як падрыў веры ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[1] Экасістэма культуры (ад грэч. oikos – дом, радзіма) – сістэма, якая здольна прапанаваць змест і сродкі дзеля захавання роднага культурнага асяроддзя, «механізм» уключэння гісторыка-культурнай спадчыны ў сучасную свядомасць. Дэфініцыя ўтворана ад паняцця «экалогія культуры».

[2] Бхавадгіта – збор сакральных тэкстаў ведычнай рэлігіі індаарыеў II-I тыс да н.э..

[3] Перадусім – ва «установах дадатковай адукацыі», маючых справу з навучаннем народнай культуры.

[4] Анамія – ў дадзеным выпадку слабая этнічная самаідэнтыфікацыя (недакладнае далучэнне сябе да этнічнай супольнасці) .

[5] Паняцце «экалогія», якое да нядаўняга часу адносілася да прыроды і звязанага з ёй ладу жыцця людзей, пераносіца сёння на адносіны да культуры і нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны. Акадэмік Д.С.Ліхачоў адзначаў дыялектычную ўзаемасувязь экалогіі біялагічнай і экалогіі культуры: «Чалвек жыве не толькі ў прыродным асяроддзі, але і ў асяродку, створаным культурай яго продкаў ды ім самім … калі прырода неабходна чалавеку дзеля яго біялагічнага жыцця, то культурнае асяроддзе неабходна дзеля яго духоўнага сталення, яго маральнай самадысцыпліны і сацыяльнасці».

сябе – небяспечны для душэўнага і інтэлектуальнага развіцця, творчага раскрыцця, псіха-фізічнага стану асобы. Але ж, тыя сумненні насамрэч часам безпадстаўныя, таму, што мы не можам быць выкрэслены са сваёй этнапрасторы: яе складальнікі закладзены ў нашу падсвядомасць, яе рытмы пульсуюць у нас, праявамі «прарываюцца» праз нашу генетычную памяць – у трапным слове, выразе, у спосабе мыслення і выказвання думкі, музычнай і мастацкай творчасці. У эмацыйным і душэўным дыяпазоне.

Чым больш разважаць і «мучыцца» над «беларускім пытаннем», адцягваць яго вырашэнне, тым больш вострa яно нам адгукнецца потым. Ужо сёння неабходна вырашаць сапраўды дзяржаўную праблему – вяртання беларускіх вучняў у сваё этнічнае культурае поле – этнапрастору Беларусі. І разуменне гэтага захаду – педагогамі, дзецьмі, бацькамі, работнікамі культуры – дапаможа здзейсніць, здаецца «няздольнае»: прыгадаць, аднавіць, запоўніць «белыя плямы» свайго культурнага існавання – і тым застацца, быць і квецiць на культурнай мапе свету. Так, калі для некаторых еўрапейскіх краін праблема «аднаўлення» з'яўляецца даволі складанай, таму, як традыцыйны кантэкст іх нацыянальнай культуры ўжо пакрысе знікае (Польшча, Венгрыя, Латвія), і часцяком фальклорнае мастацтва ўжо набывае стылізаваныя формы (Нарвегія, Францыя, Іспанія, Ірландыя), альбо ўвогуле, існуе як сувенірны напамін (Германія, Швецыя, Данія, Велікабрытанія), – то для Беларусі праблемы аднаўлення не існуе ў прынцыпе. Хутчэй за ўсё, гэта праблема пераемнасці, ды форм, метадаў, методыу, тэхнік пераймання. Бо амаль ва ўсіх рэгіёнах Беларусі жыве народная традыцыя, альбо захавана ва ўспамінах носьбітаў.

І калі ў навучальных планах і праграмах па выхаванню на дзяржаўным узроўні вывучэнню народных традыцый не надаецца належнай увагі, то на месцах выбудоўваецца і навучальны план этнаграфічных заняткаў, і, нават, канцэпцыя «фальклорнай адукацыі». У беларускім варянце этнакультурнага выхавання, асноўныя палажэнні фальклорнай адукацыі таксама «дыктуе» традыцыя:

- к а л я н д а р н а с ц ь як ф о р м а бесперапыннага жыццятварэння (пражывання часу) калектыву (групы, класа) у цыкле гадавых народных святаў (па колу: «Вясна – Лета – Восень – Зіма»);

- р э г і я н а л ь н а с ц ь – як з м е с т этнакультурнага выхавання (мясцовы спеўны, музычны, харэаграфічны рэпертуар і манера выканання; ткацтва, вышыўка, саломапляценне з захаваннем мясцовых стыляў, тэхнік, матэрыялаў; мастацкае краязнаўства). Рэгіянальнасць – як умова натуральнага сапраўднага засваення нацыянальнай культуры, у паслядоўнасці: культура маёй вёскі – краю – рэгіёну – сумежных рэгіёнаў – Беларусі.

Напрацягу апошніх год у Акцябрскім, Чачэрскім, Барысаўскім раёнах настаўнікі, педагогі школ і цэнтраў творчасці, дзіцячых садкоў, кіраўнікі фальклорных калектываў, руплiўцы культуры свайго краю праводзяць незвычайную, вялікую працу па захаванню і ўзнаўленню мясцовых традыцый – як асновы этнакультурнага эстэтычнага і патрыятычнага выхавання дзяцей і моладзі – будучых грамадзян Рэспублікі Беларусь. А спосабы ўзнаўлення-пераймання падказвае сама традыцыя: вывучыць песню «з голаса» (паслухаць-прапяяць, ці запісаць на магнітафонную стужку). Засвоіць танец «у танцы», гульню «у гульні», разам з носьбітамі традыцыі, і г.д.

Гэта сапаўды перспектыўны досвед вяртання ў культурную прастору свайго краю – Акцябршчыны, Чачэршчыны, Барысаўшчыны – які магчыма пераняць і іншым раёнам і гарадам Беларусі. Вопыт штодзённай руплівай працы, якая праводзілася шмат год, здзяйсняецца і зараз – пэўнымі людзьмі і на пэўных месцах. А менавіта: ў СШ вёскі Валосавічы Акцябрскага раёна, фальклорным калектывам якой кіруе Валянціна Кульбіцкая; ў СШ № 3 г.п. Акцябрскі, знакамітай сваім калектывам «Рудабельскія зорачкі» і іх яркай «зоркай» – кіраўніком Вольгай Дульскай. А таксама шматлікія фальклорныя калектывы раёна, дзейнасць якіх каардынуе і заахвочвае загадчыца аддзела культуры Акцябрскага раёна С.А.Беразоўская. Гэта і цудоўны досвед Мётчанскай СШ Барысаўскага раёна ды яе фальклорнага калектыву «Берагіня», які ўжо ўпісаны ў гісторыю адраджэнскага фальклорнага руху на Беларусі. Праца гэтага танцавальнага ансамбля, яго музычнага кіраўніка і завуча школы Антаніны Анатольеўны Абрамовіч, ды ўсяго педагагічнага калектыву Мётчанскай школы на чале з дырэктарам Уладзімірам Лайковым – сапраўдны ўзор этнапедагагічнага выхавання і ўключэння ў культурную этнапрастору Беларусі: калі заняткі па фальклору з'яўляюцца не адарванай ад адукацыйнай праграмы дысцыплінай, а часткай эстэтычнага і музычнага выхавання, адпраўной ступенню ўводзін у гісторыю, культуру і мастацтва краіны, вехай духоўнага сталення і крыніцай душэўнага росквіту дзяцей. У культуры свайго краю сябе сцвярджаюць і гэтым ганарацца калектывы вясковых школ Чачэрскага раёна: Бяляеўскай базавай школы, якой кіруе Святлана Марозава, Меркулавіцкай СШ, дырэктар якой – Любоў Галубіцкая – поруч з харэографам Аленай Бозікавай далучаюць вучняў і настаўнікаў праз заняткі ў школьным фальклорным ансамблі да багатай спадчыны Чачэршчыны; гэта заўсёды малады і жыццясцвярджальны фальклорны калектыў «Лёс» Бабіцкага СДК і яго кіроўца Пятро Біжуноў. Ужо сам назоў гурта нібы сімвалізуе адвечнасць у спадкаемстве культуры і традыцый – ад продкаў, праз носьбітаў – сваім нашчадкам, нашым дзецям. І толькі можна дзівіцца, але ж і вучыцца ў гэтых таленавітых дзяцей і іх настаўнікаў, кіраўнікоў калектываў і аўтэнтычных выканаўцаў – іх шчырасці і любові да бацькаўшчыны, іх разумення нечага такога, што ведае … наша зямля.

Любы досвед – гэта вынік працы: руплівай і скаардынаванай. На базе менавіта гэтых школ – Акцябрскага, Чачэрскага і Барысаўскага раёнаў – была некалі распачата справа выхавання дзяцей сродкамі адраджэння народных традыцый этнахарэографам, вядомым дзеячом культуры Беларусі, педагогам і фальклярыстам Міколам Аляксеевічам Козенкам. За шмат год працы ў галіне этнапедагогікі ім была распрацавана праграма навучання і выхавання ў традыцыі (праз танец, музыку, песню, гульню, народнае мастацтва), якая сёння

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

выкрышталізавалася ў канцэпцыю беларускага этнакультурнага выхавання «Танцавальны фальклор і дзеці», станоўчы змест і стваральны патэнцыял якой штогод сцвярджаюць народныя святы і выставы, навукова-практычныя канферэнцыі і семінары, якія сістэмна ладзяць Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры, Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі на матэрыяле педагагічнага і культурна-асветніцкага доследу школ і клубаў вышэйназваных раёнаў. І, канешне, вядомыя на на ўсю рэспубліку фестывалі фалькорнага мастацтва «Берагіня» (Акцябрскі р.), «Беларуская полька» (Чачэрскі р.), «Мядоцкі край і яго таленты» (Барысаўскі р.), «Радавод» (Брэсцкая вобл.), «Танцы пад гармонік» (Любанскі р.), «Гуканне вясны ў Парку Горкага» (г.Мінск).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ